**УДК 39**

# ЧАРАЎНІЦА Ў СТРУКТУРЫ ВЯСКОВАГА СОЦЫУМА: СІМВАЛІЧНЫ СТАТУС І ФУНКЦЫІ

***І. Г. БОНДАР***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*У артыкуле разгледжаны сімвалічны статус чараўніцы ў традыцыйным грамадстве беларусаў. Уяўленні пра асоб якія могуць аказваць шкадаactive ўплыў на навакольны свет, застаюцца даволі трывалымі і ў сучаснай культуры вясковага насельніцтва Беларусі. На сённяшній дзень у якасці актуальных сюжэтаў пра чарадзейства выступаюць жаночыя вобразы. Вобраз чараўніцы ў традыцыйнай карціне свету далёка не стэрэатыпны і мае шмат нюансаў, не ў малой ступені абумоўленных гендэрнымі фактарамі.*

***Ключавыя словы:*** *чараўніца, ведзьма, падлогі, сурокі.*

Чарадзейства, у народнай традыцыі, абагульненае найменне ўсіх выпадкаў магіі, якія маюць шкаданосны ўплыў на людзей, жывёл, прыродныя з'явы, ураджайнасць і на іншыя аб'екты навакольнага свету. Магія займае асаблівае месца ў жыцці традыцыйнага грамадства. Носьбітаў звышнатуральных здольнасцяў у рэгіёнах Беларусі называюць па рознаму: *шаптун (шаптуха); вядзьмар (ведзьма); чараўнік (чараўніца) і інш.* Вобраз і сімвалічны статус чараўнікоў у традыцыйнай карціне свету мае свае лакальныя асаблівасці, на якія мае уплыў: канфесійная структура насельніцтва, узровень мадэрнізацыі, асаблівасці этнакультурнай гісторыі рэгіёна, прыналежнаць к этнасу, немала нюансаў абумоўлены гендарнымі фактарамі.

Жанчыны, якія валодаюць шкаданоснай магіяй, меюць лакальную спецыфіку наймення. Так у адным рэгіёне іх завуць ведзьмамі, у іншым – чараўніца, а на памежжы – калдуннямі. Паводле народных уяўленняў, ведзьма – гэта дэманічная істота, якая паводле народных уяўленняў злучана з звышнатуральнымі здольнасцямі, служка Чорта, Шатану, Д'яблу, жаночае ўвасабленне "нячыстай сілы. Ёй прыпісаны здольнасці негатыўна ўплываць амаль на ўсе віды гаспадарчых спраў, напрыклад на ўраджай, на малочнасць кароў і напусканне сурокаў, таксама яна здольная перакідвацца ў розных істот. Псота хатняй жывёлы – галоўная функцыя ведзьм.

Як лічылася, дзейнасць ведзьмы праяўляецца ў адпаведнасці з каляндарнымі датамі і часам сутак. Найбольшая актыўнасць ведзьмаў выяўляецца на ноч Івана Купала, Юр'еў дзень, Масленіца. У межах сутак самым небяспечным часам лічылася ноч і поўнач, радзей – поўдзень, час да ўзыходу і пасля заходу сонца. *"Як толькі Купала, нада ёй калі хат пахадзіць, траву парваць ці якіх-небудзь трэсак схваціць сабе. Дык яе пільнавалі, а мужык адзін яе дапільнаваў, якраз на Купалу. Выйшла яна з хаты і пайшла, а ён ужо глядзіць за ёй, што пашла яна і раздзетая, як маць радзіла, і панесла нейкую трапачку ў руцэ. А яна пайшла і па расе гэту, мусіць цадзілку, цягаіць [...] Пацягала, а тады цадзілку гэтую скруціла і траву нарвала, і ў вядро, і пад паху, і панесла" (Глыбоцкі р-н)* [6, с. 11].

Згодна з уяўленнямі беларусаў, магічная сіла і звышнатуральныя здольнасці ведзьмы маглі быць прыроджанымі, або пераданыя ад маці-ведзьмы. Маглі быць набытымі ў выніку кантактаў з нячыстай сілай, напрыклад ад чорта, альбо ад паміраючай ведзьмы, якая перадавала свае здольнасці каму-небудзь з прысутных. Ведзьм называюць палюбоўніцамі чорта, то бок яны знаходзяцца ў непасрэднай сувязі з чортам. У сувязі з усім гэтым ім і належыць амаль самая дурная рэпутацыя ў вясковай супольнасці.

Даследчык XIX ст. А.Я. Багдановіч адзначаў, што ва ўяўленнях беларускага насельніцтва дзякуючы любоўнай сувязі з чортам, ведзьма навучылася ад яго вядзьмарству, даведалася аб тайных уласцівасцях некаторых траў і каранёў. Таксама, калі яна дапоўніць лісінае сэрца і кашачую печань, і пры гэтым будзе чытаць загавор, тады яна збірае чароўную вадкасць, якая дае маладосць і прыгажосць, або незямную прывабнасць. Дзякуючы гэтай вадкасці, ведзьмы маюць здольнасць лятаць, што і дазваляе ведзьмам наведваць шабашы, д'ябальскія гульні, якія адбываюцца ноччу на высокай гары [2, с. 141-144].

Паводле некаторых уяўленняў, ведзьма жыве сярод людзей, але адрозніваецца ад суседзяў знешнім выглядам, паводзінамі, характарам. Напрыклад, кабета, якая жыве ў адзіноце, нязветлівая, з дзівацтвамі. У яе можа быць падвойны рад зубоў, барадаўкі, пучкі валос на твары, адсутнасць некалькіх пальцаў або "лішнія" пальцы, хвост, зрослыя бровы, кульгавасць, горб, крукаваты нос і іншыя адхіленні, якія не прывыклі бачыць звычайныя людзі. Існуе меркаванне аб тым, што ў ведзьм незвычайны погляд, папоўненыя, счырванелыя і дзікія вочы, таксама ў яе ёсць звычка не глядзець прама ў вочы [3, с.79].

У народнай інтэрпрэтацыі мужчыны і жанчыны, якія валодаюць магічнымі здольнасцямі, істотна адрозніваюцца, бо жаночае чарадзейства заўсёды разглядаецца вяскоўцамі як з'ява ніжэйшага парадку,

звязаная з гаспадарчымі справамі, чым мужчына-чараўнік практычна не займаецца. Вядомы даследчык народнай культуры Віцебшчыны М. Нікіфароўскі адзначыў у сваёй працы, што чарадзеямі могуць быць як мужчына, так і жанчына. Таксама ён піша, што жанчыны звычайна займаліся "бабскімі справамі" – чараваннем хатняй скаціны, насыланне хвароб, псотай на палетках, сурокамі, падлогамі. Мужчыны ж, хоць таксама могуць гэта рабіць, але амаль ніколі не апускаюцца да гэтых "бабскіх спраў" [4, с. 283]. Гэты тэзіс знаходзіць пацверджанне ў беларускай народнай культуры ХХ – пачатку ХХІ ст. *"А чары – гэта болей ідзець ад баб. Мужчыны што, будуць з каровай тваёй што робіць? Усё бабы. Яны і цяпер ёсць, то сметану адберыць, то яшчэ што. А як узнаць… Ну, апрыдзіляюць па наследству. Ну, вот там бабушка што дзелала, ці яшчэ хто. Яны болей перад Янам робяць. Я раз помню, у мяне карова была, а адна баба, яна памёрла, раніцай, расой, а яна ўжо лётала па траве, шукала за хлявом на Яна. Вот нешта ж робіць" (Шаркаўшчынскі р-н)* [6, с. 106].

"Бабскія справы" характэрны да ХІХ – ХХ стагоддзя. Псаванне жывёліны або загуб ураджаю былі накіраваныя не толькі на шкоду гаспадара, але і на карысць чараўніцы. Ян Баршчэўскі адлюстраваў у сваім рамане выпадак, калі сяляне падазравалі адну жанчыну ў адбіранні малака: "бо сама мела вельмі мала жывёлы, але прадавала масла і сыры ў горадзе" [1, с. 61]. У большасці выпадкаў чараўнікі шкодзілі сваім суседзям, і прычынай, як правіла, былі побытавыя канфлікты.

Этнаграфічныя экспедыцыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта зафіксавалі ў значнай колькасці розныя апавяданні пра ведзьм-малочніц  практычна ва ўсіх раёнах Віцебшчыны. *"А потым можа і карове, і сьвіням што-та здзелаць [...]. Ну, у нас тожа былі. Яна адтуль з-пад Дрысы. І ў нас была карова. І яна (Марыя-суседка) ўмела ўсе дзелаць. Вот пайшла мама карову даіць, а яна прыйшла і гаворыць: "Фрося, дай мне навозу". І тады карова ў  нас забалела. І ўсе малако пайшло па-за шкур'ю. І карова наша здохла"* [5, с.  22]*"Ведзьма або чараўнік пускаюць сваю карову ў чэраду разам з другімі каровамі, тагды ад тых кароў усё малако пераходзіць да каровы чараўніка" [3, с.147]*

У аповядах пра ведзьм вельмі папулярны сюжэты пра заломы на палетках. Звесткі з мужчынамі-чараўнікамі таксама сустракаюцца, але ў адзінкавых выпадках. *"Вот адзін мужык прыходзіць і гаворыць жонцы: "Гілена, ідзі паглядзі – залом у жыці". Значыць, жыта завязана на вузёл. А яна: "Ай, Максім, ня жні. Ай, я гэтым забабонам ня веру", – і зжаў. І яго тут жа скруціла [...] Аддзелалі яму, яшчэ троху пажыў" (Лепельскі р-н)* [6, с. 42].

У другой палове ХХ – пачатку ХХІ ст. актуальным сюжэтам у апавяданнях пра чарадзейства з'яўляецца аповеды пра шкаданосныя *падлогі,* або "падклады". Пад падкладам маецца на ўвазе рэчы з выразнай сімволікай, напрыклад смерці ці хваробы, якія наўмысна і таемна размяшчалі ў жыццёвай прасторы людзей. Актуалізацыя чараў супраць асабістай долі чалавека (здароўя, сямейнага ладу), ці яго прысядзібнай гаспадаркі абумоўлена тымі абставінамі, што пагалоўе хатняй жывёлы, як аб'ект магічнага ўздзеяння, радыкальным чынам зменшылася. *"І аднажды я ўвідзела сваю саседку, выбігаюшчай, а тут у меня і кусцікі раслі [...] Всё там падкладавалі,[...] всякія вузлы накручана, назавазвана было там всего. І вот я віжу адзін раз яна выбежала із моего агарода, і бегом! Ані ж тагда не должны з кем-та разговарівацъ, так говорят людзі, я там плоха, в этом понімаю, но думаю, чэво-та яна там дзелала, на маём агародзе [...] І клубніка была красная і крупная, вся высохла до едзінава! І тыя красныя ягадкі высахлі. І всё. І я нашла там пакет такой, чэво-та там накручана. Правда я бросіла ей, на её агарод этот пакет" (Верхнядзвінскі р-н)*[1]*; "Ёсьць падклады! Адна баба адбіла ў другой мужыка. Ён кінуў першую жонку і перайшоў да яе, другой ужо. І тут пачала гэта другая сохці, бо першая падкінула ёй яйка пад хату. Другая жонка спужалася і кінула тое яйка ў раку. Яна сразу жа палепшыла, але мужык той памёр." (Ушацкі р-н)* [6, с. 17].

У большасці выпадкаў чараўніцы шкодзілі сваім суседзям і прычынамі, як правіла, былі побытавыя канфлікты і няпростыя асабістыя ўзаемаадносіны. Напрыклад зайздрасць, маёмасныя прэтэнзіі, персанальныя крыўды, асабістая антыпатыя, і інш. Існуе два сцэнарыя вырашэння  канфліктаў: дэманстрацыя звышнатуральных здольнасцяў і ўчыненне шкоды ў любой сферы жыццядзейнасці ахвяры. *"Дзяўчына, і яна гэта нешта вот ей панравіўся мой [...] ў іхнім сяле была бабка, што ўмела зрабіць. І мы пайшлі на работу, і вот ішлі з работы, жарка было і бабы сабраліс усе да гэтай бабы да хаты папіць вады, яны п'юць ваду, а яна круценька квас мне з хаты вынесла, там ужо мусіць быў зроблена [...] я выпіла гэтага кваску і там недалёка адтышлася, яшчэ і бабы гэтыя ідуць, а мене ташніць начало [...] і я вот гэта поняла, што гэта ад кваску"(Міёрскі р-н)*[2]*; "У нас гэтая самая жанчына, яна адбіраець ад маладых людзей, бярэць інергію. Са старымі яна не дружыць, а яна вот да маладых лезіць смольлю, каб вот з імі дружыць. Тады што-небудзь даець. Ці зёлкі, ці цвяты, ці штонебудзь, ці канфеціну – яна ўсё роўна будзець прынасіць нахалам. Будзіць ці рабятам даваць, каб гэта ўжо як-небудзь узяць ад іх. Вот.*

---

[1]ФА ПДУ: зап. Бондар І.  у 2019 г. ад Рудлевскай Ганны Станіславаўны, 1943 г. н. у г. Верхнядзвінск.
[2]ФА ПДУ: зап. Лобачам У. А., Сумко Е. В., ад Аляксандроўскай Феафаніі Васілеўны, 1928 г. н.ў вёсцы Язна Міёрскага раёна (нарадзілася ў в. Забор'е таго ж  раёна).

*Яна вот ужо 80 гадоў з лішнім і ходзіць яшчэ. Яна вот і за каровай за пасту падойдзець" (Шаркаўшчынскі р-н)* [6, с. 27].

Згодна з уяўленнямі беларусаў ведзьмы здольны ператварацца ў розных істот, такіх як птушка, жаба *(жаба-рапуха)*, кабыла, котка, ласка, белая сарока. Апошняя істота таксама нясе шкоду і хаос, яна сустракаецца ў рамане Я. Баршчэўскага [1, с. 98-105]. Гэтыя перакідванні адбываюцца з мэтай таемна нанесці шкоду, напрыклад адабраць малако ў каровы суседа ці суседкі і інш. *"Як Купала, "дзядоў" у хлеў кідалі, каб ня лезла [ведзьма]. Жабамі робюцца. Узяла палку ды ёй па нагах. А тады чую: Манька ляжыць, ня ходзіць. У нас было. Пашла я к аднай. Узяла на карты кідала. Узяла наліла вады ў стакан, нешта шаптала. І там узялі абразаваліся два чарвячкі чорненькія. Ні яна там што кідала, толькі пашаптала над гэтай вадой. Адзін аднага лавіў, лавіў, але ўлавіў і ўсё кончылася. Вот як будзець сонца захадзіць, вядзіце кароўку ў хлеў. Прывялі да хлява, а там аж чорна жаб гэтых, так і прыгаюць прама на ногі карове. А там будзець паўзці сама бальшая жаба. Ты вазьмі пруток і ей па спіне. Толькі ў смерць ня бі. А яна толькі: ай! І ножкі выпруціла. Эта ей тады трудна. А назаўтра стаім у магазін за камсой. А я ў дачкі той, што чаруіць, пытаюся: "А матка чаго не прышла?" А яна: "А яна ўчора, як сонца захадзіла, як крыкнула: ай, спіна! І ляжыць". А я думаю: Мала дала." (Верхнядзвінскі р-н)* [6, с. 25].

Лічылася, што фізічныя пашкоджанні, нанесеныя чараўніцам, дазваляюць выявіць яе ў вясковым соцыуме, бо, згодна з пашыранымі ўяўленнямі, рана застаецца і пасля адваротнага пераўвасаблення. Чалавек знаходзячы у сваім хляве жабу, імкнуўся яе неяк пакалечыць. Калі на наступны дзень адна з суседак хадзіла пабітая, гэта значыць, што яна і ёсць ведзьма. *"Дружыў парэнь з дзяўчонкай. Як толькі сядуць на лавачцы, а кошка бегаець, круціцца, не даець ім пасядзець [...] Тады, гавораць, узяў з сабой тапор і як толькі кошка бегла, ён ёй па лапе і адсек лапу. Ага. Вот пасядзелі яны, пайдзём дамоў. Прыходзць, а маць на печы ляжыць. І на утра не ўстаець. А маць не хацела, каб ён з гэтай дзеўкай дружыў, каб браў яе. Вот яна здзелаецца кошкай і бегаець кала іх. Эта сын мацеры руку адсек" (Лепельскі р-н)* [6, с. 7-8].

Шэраг чараўніц меў амбівалентны статус у вясковай грамадзе – маглі як наносіць шкоду, так і пазбаўляць ад яе. Звесткі аб лекарскіх здольнасцях чараўніц часцей сустракаюцца, калі гаворка ідзе пра сурокі, наведзенне псоты, хваробы. Лекарскім здольнасцям чараўніц адпавядае спецыялізацыя на такіх хваробах, дзе прычынаю станавіліся зламыснае ўздзеянне. *"Ну, саседка наша яна кароў лечыць. Можа, што і людзям даець. Ейная матка, гэта яшчэ здаўна. Гэта ўсе іхнае атроддзе, усе лячылі. [...] І вот такая жанчына адна ў нас есць. Правяла рукой карове па мордзе усё. Дамой прывяла – не падаіла. [...] У нас гэтая самая жанчына, яна адбіраець ад маладых людзей, бярэць інергію. Са старымі яна не дружыць, а яна вот да маладых лезіць смольлю, каб вот з імі дружыць. Тады што-небудзь даець. Ці зёлкі, ці цвяты, ці штонебудзь, ці канфеціну – яна ўсё роўна будзець прынасіць нахалам" (Шаркаўшчынскага р-на)* **[6, с. 27].**

Такім чынам, у сучасны перыяд у апавяданнях пра чарадзейства найбольш фігуруюць жаночыя вобразы. Пры гэтым, у адрозненні нават ад сярэдзіны XX ст., адбываецца змяшчэнне сферы "дзейнасці", калі меркаваныя ведзьмы пераносяць свае шкаданосныя практыкі з хатняй жывёлы і палеткаў на здароўе людзей і іх асабісты лёс.Лічылася, што ведзьма жыве сярод людзей, але адрозніваецца ад суседзяў знешнім выглядам і паводзінамі. Дзейнасць чараўніц і ведзьм на беларускам Падзвінне рэалізуецца ў выглядзе "бабскіх спраў" (г.зн. у сферы гаспадарчых спраў). Яны чаравалі на кароў, на ўраджай, пасылалі шкоды людзям і адбіралі іх жыццёвую энергію, але не ўсе. Згодна з народнымі ўяўленнямі, былі і такія чараўніцы, якія здымалі псоты і сурокі, дапамагалі вылечыцца ад хвароб. Найчасцей лекавыя здольнасці сустракаюцца ў выпадках з ляэннем жывёлы і з "лячэннем" сурокаў. Аднак негатыўнае значэнне вобраза чараўніцы ў вясковай грамадзе пераважае.

ЛІТАРАТУРА

1. Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2005. – 214 с.
2. Богданович, А. Е. Пережитки Древнего Миросозерцания / А. Е. Богданович. – Гродна: Губернская Типографи 1895. – 186 с.
3. Зямная дарога ў вырай. Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 3 – Мінск : Беларусь, 2010. – 717 с.
4. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи… Витебской Белоруссии / Н. Я. Никифоровкий. – Витебск: Губерн. Тип-литограф., 1897. – 338 с.
5. Полацкі этнаграфічны зборнік/ склад. У. А. Лобач, У. С.Філіпенка. – Вып. 1: Народная медыцына беларусаў Падзвіння: у 2 ч. – Ч. 2. - Наваполацк : ПДУ, 2006. – 332 с.
6. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Ч. 2. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – 368 с.